# Мовазнаўства

Л. М. ШАКУН

## МОВА ЯК ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НАРОДА

Мова — адна з тых найважнейшых адзнак, на падставе якіх вылучаюцца народы, вялікія і малакалькасныя. Яна ж з'яўляецца бадай ці не самым галоўным фактарам самавызначэння народа, усведамлення яго як асобнага этнічнага аб'яднання. Станаўленне народа і пачынаецца, па сутнасці, з таго, як у агульнай плыні развіцця чалавечага грамадства ў пэўнага соцыуму ўзнікае ўсведамленне сваёй моўнай тоеснасці, на падставе якой ён і адрознівае сябе ад суседніх народаў. Моўная адметнасць застаецца з ім назаўсёды — датуль, пакуль ён будзе існаваць як этнічная цэласнасць побач з іншымі народамі, пакуль яго голас будзе гучаць у шматгалоссі іншых народаў. І менавіта родная мова адкрывае народу магчымасць выявіць сваё ўласнае аблічча. Як казаў наш вялікі паэт Ф. Багушэвіч у прадмове да свайго зборніка твораў «Дудка беларуская», што выйшаў у Кракаве ў 1891 годзе: «Пазнаюць людзей па гаворцэ ці па адзежы, хто якую носе; отож гаворка, язык і ёсьць адзежа душы».

Роля мовы як фактара нацыянальнай самасвядомасці на канкрэтным матэрыяле гісторыі асобных народаў асветлена яшчэ далёка недастаткова. Няма сумнення ў тым, што ў розных народаў і ў розныя гістарычныя эпохі іх жыцця гэты фактар дзейнічаў па-рознаму, праяўляўся не ў аднолькавай ступені. У гісторыі некаторых народаў, асабліва тых, якія развіваліся ў межах шматнацыянальных дзяржаў і складалі ў іх нацыянальную меншасць, ён набываў прыярытэтнае значэнне.

Да такіх народаў і адносіцца беларускі народ. Лёс яго склаўся такім чынам, што працяглы час ён не меў сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці і ва ўмовах жорсткага сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту вымушаны быў не толькі адстойваць права на нацыянальнае самавызначэнне, але наогул весці ўпартую барацьбу за сваё існаванне. У гэтай барацьбе, якая ўрэшце рэшт прадвызначалася пэўнымі сацыяльна-палітычнымі і эканамічнымі фактарамі, мове адводзілася роля служыць у працэсе фарміравання і росту нацыянальнай самасвядомасці сродкам самасцвярджэння народа, падставай для таго, каб прызнаць яго асобным этнасам. Адзін з лідэраў беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст. Я. Лёсік так гаварыў пра гэта: «Для нас... мова становіць усё: нашу палітыку, экономію і наш грамадзянскі лад жыцьця... Народ наш растраціў сазнаньне свайго нацыянальнага адзінства, ён аграблены і культурна і гістарычна, а калі мы цяпер упэўнена гаворыма а беларускім народзе, то галоўным чынам маем на ўвазе мову, якая злучае ў адзіны народ пераважную большасьць насельнікаў этнографічнай Беларусі. Іншага злучніка ў беларускага народу пакуль што няма. Адгэтуль відаць, што мова — гэта адзіны наш скарб, што захаваў народ наш ад

свае прошласьці і што, такім чынам, толькі мова «з нядолі нас вызваліць...» (Вольны Сьцяг. 1921. № 4/6).

Усведамленне моўнай агульнасці ўзнікае ў соцыуме, як можна меркаваць, непасрэдна ў яго вусна-гутарковай практыцы, якая вельмі чуйная да «свайго» і «чужога», здольна аб'ядноўваць і адрозніваць людзей паводле моўных прымет. Менавіта такім шляхам развіваліся дыялекты і мовы ў дапісьмовы перыяд. Паводле гэтага прынцыпу адрозніваюцца і зараз моўныя аб'яднанні, якія не зафіксаваны ў пісьменнасці. Усё ж моўнае адзінства ў межах пэўнага кантынуума выяўляецца найбольш яскрава на пісьме, дзе выпрацоўваюцца агульнапрынятыя, больш або менш паслядоўна вытрыманыя правілы карыстання моўнымі сродкамі, хоць самі гэтыя правілы спецыфічна адлюстроўваюць вусна-гутарковую практыку, не ў аднолькавай меры — мацней або слабей абапіраюцца на яе. Пры атаясамліванні народа, вядома, улічваюцца, акрамя этналінгвістычных фактараў, дзяржаўныя і сацыяльна-палітычныя ўмовы яго жыцця, пэўныя гістарычныя традыцыі, аж да асаблівасцей веравызнання і г. д. Аднак мова застаецца ў гэтай справе найбольш дзейсным чыннікам. Не выпадкова ў старажытныя часы гісторыі ўсходніх славян народ і мова абазначаліся адным і тым жа словам — язык. У аснове гэтага абазначэння, як бачым, ляжаў лінгвістычны фактар.

Узнікае пытанне: калі, у якіх умовах гэты фактар стаў асабліва яскрава праяўляцца ў гісторыі беларускага народа?

Гэта пытанне не такое простае, як здаецца на першы погляд. Беларускі этнас пачаў фарміравацца ў далёкім мінулым. Ёсць розныя меркаванні адносна часу і абставін яго фарміравання. Гэта адно з тых пытанняў, якія з'яўляюцца найбольш складанымі ў славістыцы. Вядома, што доўгі час многія наогул адмаўляліся па розных прычынах разглядаць беларускі народ як асобны славянскі этнас. Нігілістычныя выказванні наконт самастойнасці беларускага народа можна пачуць і ў наш час, і не толькі сярод абывацеляў, але нават у навуковых колах. Пісьмовы перыяд у гісторыі ўсходніх славян пачынаецца па сутнасці з XI ст., і ўсё тое, што папярэднічала гэтаму перыяду, выяўляецца з вялікай цяжкасцю. Гэта, зразумела, ускладняе і рашэнне пытання аб першапачатковых этапах фарміравання беларускага этнасу. Тут прыходзіцца зазірнуць у глыбокую мінуўшчыну, пачынаць «ад пачатку» — яшчэ з дапісьмовага перыяду, а ў нас, на жаль, не такія ўжо багатыя звесткі пра тое, якімі моўнымі асаблівасцямі характарызаваліся асобныя групы ўсходніх славян у тую пару. Нашы раннія пісьмовыя помнікі, напрыклад, першапачатковы летапіс «Аповесць мінулых гадоў» або «Слова пра паход Ігаравы» акцэнт робяць на сцвярджэнне этнічнай агульнасці старажытных усходніх славян. Больш таго, у старажытных пісьмовых помніках выяўляецца спроба праз царкоўнаславянскую кніжную мову, якой карысталіся не толькі ўсходнія славяне, перакінуць мост і да моў іншых славян. Трэба ўлічваць і тое, што пісьмовыя традыцыі не спрыялі выяўленню моўных асаблівасцей розных рэгіёнаў усходняга славянства. Старажытны летапісец, гаворачы пра ўсходнеславянскія плямёны ў далёкім мінулым, не прамінае адзначыць, што ўсе яны мелі свае адметныя звычаі і норавы, законы і паданні, але разам з тым падкрэслівае іх моўнае адзінства: «се бо токмо словѣнескъ язык в Руси» (Лаўрэнцеўскі спіс «Аповесці мінулых гадоў»). Цяжка зараз канкрэтна ўявіць сабе ў дачыненні да гэтай пары мясцовую моўную спецыфіку на землях сучаснай Беларусі — мы валодаем адносна гэтага толькі фрагментарнымі звесткамі.

Больш яскрава пачынае праяўляцца моўная спецыфіка нашых продкаў з часоў заснавання Вялікага княства Літоўскага. Гэту феадальную дзяржаву насялялі розныя народы; на яе тэрыторыі вялася пісьменнасць на розных мовах, але ў пераважнай большасці на беларускай, якой былі нададзены функцыі дзяржаўнай мовы. Пісьмовыя помнікі той пары вельмі пераканаўча засведчылі моўную агульнасць беларусаў. Агульнасць мовы, а таксама тэрыторыі і культурна-этнічных традыцый,

замацаваных сумесным жыццём многіх пакаленняў, іх барацьбой за сваю незалежнасць, не маглі не садзейнічаць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа і з'яўляліся істотным фактарам у яго супраціўленні націску іншаземных сіл, што пагражалі яму асіміляцыяй.

У творах старажытнай беларускай літаратуры нярэдка можна сустрэць словы гордасці за свой народ, заклікі адстойваць сваю нацыянальную незалежнасць, берагчы нацыянальна-культурныя каштоўнасці і родную мову. Ды і ў самім звароце пісьменнікаў да роднай мовы як сродку творчасці і адыходзе ад канонаў царкоўнаславянскага пісьма яскрава праявілася імкненне беларускага народа да нацыянальнага самасцвярджэння, упэўненасць у сваіх уласных творчых сілах і магчымасцях. Менавіта ў эпоху Вялікага княства Літоўскага на працягу некалькіх стагоддзяў беларускі этнас аформіўся ў сваіх галоўных рысах, у тым ліку моўных.

Але нават у дачыненні да гэтай эпохі ў гісторыі беларускага народа наўрад ці можна яшчэ гаварыць пра дастаткова строгае акрэсленне ім сваёй этнічнай супольнасці. Ускосным сведчаннем гэтага з'яўляецца такі факт, як адсутнасць у беларускай пісьменнасці паслядоўна вытрыманай тэрміналогіі для яго абазначэння. Звычайна ён выступае пад назвай «рускі» народ. У гэтай традыцыйнай назве, відавочна, праяўляецца ўсведамленне беларускім народам сваёй роднасці з іншымі ўсходнеславянскімі народамі. Этнонімы «беларусы», «беларусцы», «ліцвіны» пашырыліся параўнальна позна, хоць сам тэрмін «Белая Русь» узнік намнога раней і прымяняўся ў дачыненні да беларускіх земляў ужо ў XIV ст. (спачатку ў замежных крыніцах).

Беларускі этнас складваўся ва ўмовах феадальнага гаспадарання, што не вельмі спрыяла працэсу моўнай кансалідацыі. Трэба таксама ўлічваць і этнічную блізкасць славянскіх народаў. На працягу ўсяго старажытнага перыяду на Беларусі выкарыстоўваліся ў пісьменнасці і вусна-гутарковай практыцы розныя моўныя сістэмы і сярод іх — асабліва блізкія па структуры. Гэта садзейнічала ўзаемапранікненню элементаў з адной мовы ў другую, узнікненню ўсякага роду моўных «пераходаў» і нават стварэнню гібрыдных, крэалізаваных моў. Сляды гэтых працэсаў заўважаюцца ў творах розных пісьменнікаў, у тым ліку і Ф. Скарыны, які пры ўсім сваім патрыятызме, гарачай любові да простага, «паспалітага» народа мог у сваёй творчасці даволі далёка адыходзіць ад яго мовы. На развіцці нацыянальнай самасвядомасці беларусаў адмоўным чынам адбівалася і тая асімілятарская палітыка, якая стала праводзіцца польскімі ўладамі і каталіцкай царквой на Беларусі пасля аб'яднання Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Пазней, пасля далучэння Беларусі да Расіі, распачалася русіфікацыя беларускага народа.

Калі ў XVIII ст. пісьменнасць і кнігадрукаванне на беларускай мове амаль што спыніліся, захавальнікамі нацыянальна-культурных традыцый і роднай мовы на Беларусі сталі на доўгі час сацыяльныя нізы, галоўным чынам яе сельскае працоўнае насельніцтва. Беларускі нацыянальны рух у XIX ст. развіваўся пры адсутнасці якіх-небудзь значных кадраў нацыянальнай інтэлігенцыі і эканамічнай слабасці нацыянальнай буржуазіі. Супраць гэтага руху разгарнулася жорсткая і мэтанакіраваная барацьба пануючых класаў, якая знайшла падтрымку і з боку мясцовых сацыяльных вярхоў, паколькі яна прыносіла ім выгаду. У абставінах, калі не існавала беларускай дзяржаўнасці, пад прыгнётам сацыяльнага і нацыянальнага прыніжэння частка беларусаў паланізавалася або русіфікавалася, адмовілася ад роднай мовы, якая страчвала свой грамадскі прэстыж і адыходзіла ў сферы выключна сялянскага побыту, станавілася як бы мовай другараднай, «мужыцкай». Усё гэта ўзмацняла адмоўныя адносіны да яе, параджала нацыянальны нігілізм.

Аднак разам з працэсамі затухання нацыянальных традыцый і звужэння грамадскіх функцый беларускай мовы развіваліся і адваротныя

працэсы, што ўзмацнялі супраціўленне націску іншамоўных сіл, якія пагражалі беларускаму народу асіміляцыяй і сацыяльным заняволеннем. Гэта супраціўленне не магло не садзейнічаць умацаванню нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, яго барацьбе за незалежнасць, за ўзвышэнне аўтарытэта роднай мовы. Важную ролю ў моўным згуртаванні беларусаў, а гэта значыць і ў іх нацыянальнай кансалідацыі адыграла нацыянальная літаратура, якая пачынаючы з XIX ст. няўхільна пашыралася і набывала вострае сацыяльнае гучанне. Той жа Ф. Багушэвіч пісаў, звяртаючыся да чытачоў, якія ў той час асвету атрымлівалі звычайна на рускай або польскай мове: «Яно добра, а нават і трэба знаць суседзкую мову, але наперш трэба знаць сваю... Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня умёрлі!»

Беларуская літаратура адраджалася пасля некаторага перапынку ў сваім развіцці як сродак самавыражэння і барацьбы беларускага народа за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне; яна з'явілася сімвалам яго нацыянальна-культурнага жыцця і палітычнага існавання. Перадавыя беларускія пісьменнікі і грамадскія дзеячы XIX ст., тлумачачы матывы, якія схілілі іх звярнуцца да роднай мовы, указвалі, што яны карыстаюцца ёю не толькі дзеля таго, каб быць зразумелымі народу, але што родная мова для іх надзвычай важная як фактар нацыянальнай самасвядомасці народа, як зброя ў барацьбе за сацыяльны прагрэс. Характэрна, што ў літаратурнай спадчыне XIX ст. не так ужо і часта можна напаткаць заўвагі адносна пытанняў культуры беларускай нацыянальнай літаратурнай мовы і яе эстэтычных функцый, хоць абмеркаванне такіх пытанняў, здавалася б, павінна было знаходзіцца ў цэнтры ўвагі сучаснікаў. Як можна меркаваць па тых матэрыялах, што дайшлі да нас у друку, беларускіх пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў XIX ст. асабліва хвалявала сацыяльнае становішча роднай мовы; прыходзілася даказваць яе самастойнасць і раўнапраўе з мовамі іншых народаў, заклікаць шанаваць родную мову.

Яшчэ больш узмацнілася барацьба беларускага народа за нацыянальнае самавызначэнне, за права карыстацца роднай мовай у самых шырокіх сферах грамадска-палітычнага і культурнага жыцця ў пачатку XX ст. у сувязі з агульным уздымам рэвалюцыйнага руху ў Расіі. Вялікія ўзрушэнні XX ст. асабліва моцна паўплывалі на самасвядомасць беларускага народа і яго імкненне ажыццявіць свае нацыянальныя запатрабаванні.

Працэс нацыянальнага самасцвярджэння беларусаў, такім чынам, найбольш праявіўся ў апошнія два стагоддзі. Ён суправаджаўся зацятай барацьбой за права карыстацца роднай мовай у розных сферах грамадскага жыцця. Выхад разнастайнай літаратуры на беларускай мове, бясспрэчна, узвышаў яе грамадскі прэстыж, што ў сваю чаргу ўмацоўвала нацыянальную самасвядомасць беларускага народа. Такія фактары, што ўплываюць на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, як наяўнасць нацыянальнай дзяржаўнасці, адзінства палітычных мэт і да т. п., у гэты час не маглі адыгрываць сваёй ролі, і таму цяжка пераацаніць значэнне фактара моўнай агульнасці для нацыянальнай кансалідацыі беларускага народа.

Выпрацаваныя на працягу стагоддзяў нацыянальна-культурныя традыцыі моцна даюць адчуць сябе ў наш час, калі распачалося новае адраджэнне беларускага народа. Яны трывала замацавалі ў свядомасці беларусаў іх нацыянальную адметнасць. Той факт, што не ўсе з тых, хто адносіць сябе да беларусаў, свабодна валодаюць і шырока карыстаюцца беларускай мовай, не аспрэчвае значэння моўнага фактару ў нацыянальным самавызначэнні; ён яшчэ раз падкрэслівае важнасць стварэння належных умоў для пашырэння роднай мовы ў народзе.